МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ
ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ КОЛЛЕДЖ

# МАТЕРИАЛЫ
# МЕЖДУНАРОДНОЙ НАУЧНО-ПРАКТИЧЕСКОЙ КОНФЕРЕНЦИИ МОЛОДЫХ ИССЛЕДОВАТЕЛЕЙ

**г. Барановичи**
**16–17 декабря 2003 года**

**В 2 частях**
**Часть 1**

**Барановичи**
**2003**

УДК 082 (043.2)
ББК 94
М 33

**Рецензенты:** доктор педагогических наук, профессор, действительный член БелАО, заслуженный деятель науки Республики Беларусь А.П. Сманцер; доктор психологических наук, доцент В.А. Янчук

**Редакционная коллегия:** Л.Ф. Мирзаянова (главный редактор), Е.И. Белая, И.В. Вакульчик, В.Н. Зуев, А.А. Ковалевская, Ю.В. Маслов, Е.И. Пономарева, Н.М. Сотник (1–3 направления), Е.Г. Карапетова, Ю.В. Маслов (4 направление), Е.И. Белая (5 направление), Е.Л. Малиновский, Е.И. Белая (6 направление)

**Материалы** международной научно-практической
М 33 конференции молодых исследователей, Барановичи, 16–17 дек. 2003 г.: В 2 ч. Ч. 1 / Редкол.: Л.Ф. Мирзаянова (гл. ред.) и др.– Барановичи: БГВПК, 2003.– 562 с.

ISBN 985-6616-08-5.
ISBN 985-6616-10-7 (Часть 1).

Министерство образования ... «Барановичский ... университет»

В сборнике содержатся статьи участников международной научно-практической конференции молодых исследователей.

Материалы теоретического и практико-ориентированного характера могут быть использованы преподавателями вузов, ссузов, учителями школ и студенческой молодежью, интересующейся научно-исследовательской деятельностью.

ЧИТАЛЬ... ЗАЛ

УДК 082 (043.2)
ББК 94

ISBN 985-6616-08-5
ISBN 985-6616-10-7 (Часть 1)

© Барановичский государственный высший педагогический колледж, 2003

# АКТЫВІЗУЮЧЫЯ МАГЧЫМАСЦІ ПАДРУЧНІКА І ЗАДАННЯЎ НА ВЫБАР

**В.В. Кахнюк**
Беларусь, г. Баранавічы
Баранавіцкі дзяржаўны вышэйшы педагагічны каледж

Навуковы кіраўнік – В.М. Шавель, старшы выкладчык

Вучэбнае пазнанне ў асноўным працякае двума шляхамі: рэпрадуктыўным і творчым, таму і ўзровень пазнавальнай актыўнасці можа быць розным – актыўнасць, якая адпавядае рэпрадуктыўнай пазнавальнай дзейнасці, і актыўнасць, якая суправаджае творчую пазнавальную дзейнасць. Авалоданне навучэнцамі той ці іншай формай пазнавальнай дзейнасці можа сведчыць аб сфарміраванасці пазнавальнай актыўнасці на дадзеным узроўні.

Зыходзячы з сутнаснай характарыстыкі пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў, В.А. Зімненка абгрунтоўвае такія ж крытэрыі, як:

1) крытычныя адносіны да вынікаў вучэбнай дзейнасці як сваёй, так і таварышаў;
2) імкненне пазнаць новае;
3) стан ведаў па прадмету ў адпаведнасці з патрабаваннямі праграмы па мове;
4) уменне выдзяляць істотныя прыметы ў моўным матэрыяле, уменне параўноўваць, рабіць вынік і даказваць;
5) уменне планаваць сваю работу ("з чаго пачну", "як буду працягваць", "чым скончу");
6) уменне правесці самаправерку;
7) моўная актыўнасць: уменне дакладна і хутка арыентавацца ў моўнай сітуацыі;

8) уменне пераадольваць цяжкасці, якія ўзнікаюць у вучэбнай рабоце.

Выкарыстанне крытэрыяў дазваляе вызначаць узровень пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў.

В.А Зімненка выдзяляе тры якасныя ўзроўні пазнавальнай актыўнасці на ўроку мовы:

I – высокі: навучэнцы заўсёды праяўляюць ініцыятыву на ўроку мовы, хутка і беспамылкова выдзяляюць істотныя прыметы ў моўным матэрыяле, умеюць абагульняць, ставіць пытанне да вывучанага, без цяжкасцей пераносіць веды ў новыя сітуацыі, умеюць сябе праверыць, усведамляюць ход і вынікі сваёй работы, умеюць дапамагчы таварышам.

II – сярэдні: навучэнцы, як правіла, выконваюць тое, што патрабуецца, з дапамогай дадатковых пытанняў настаўніка выдзяляюць істотныя прыметы ў моўным матэрыяле, адчуваюць цяжкасці ў абагульненні і пастаноўцы пытанняў, не заўсёды правільна пераносяць веды ў новыя сітуацыі, ажыццяўляюць планаванне з дапамогай настаўніка, пры праверцы сваіх вынікаў дапускаюць памылкі, добразычлівыя да вынікаў таварышаў, але не заўсёды ўмеюць аказаць дапамогу.

III – нізкі: навучэнцы ніколі не праяўляюць ініцыятыву на ўроку, адчуваюць цяжкасці ў выдзяленні прымет у моўным матэрыяле, не ўмеюць ставіць пытанні, не спраўляюцца з заданнямі на абагульненне і планаванне, пераважна правільна выконваць заданні рэпрадуктыўнага характару, не праводзяць самаправерку, да вынікаў другіх навучэнцаў адносяцца станоўча, але самі аказаць дапамогу не могуць.

Пры вызначэнні ўзроўняў пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў можна выкарыстаць матэрыял падручнікаў па беларускай мове, узяўшы за аснову ўзровень складанасці работы з моўным матэрыялам. Складанасць моўнага матэрыялу можна вызначыць па тым, якім метадам арганізуецца вучэбна-пазнавальная дзейнасць навучэнцаў.

Актыўнасць кожнага ўзроўню якасна адрозніваецца. Адрозненне складаецца ў тым, што якасныя змены ідуць у напрамку змяншэння рэпрадуктыўнай дзейнасці і павелічэння элементаў творчасці ў вучэбна-выхаваўчай дзейнасці навучэнцаў (ад III да I) [3].

Такім чынам, веданне магчымасцей падручнікаў па беларускай мове дапаможа адкрыць рэзервы, якія маюцца ў плане фарміравання пазнавальнай актыўнасці.

Адным са сродкаў актывізацыі гэтага кірунку дзейнасці могуць быць заданні на выбар.

Сітуацыя выбару абуджае ініцыятыву і патрэбу ў праяўленні творчых задаткаў. Дзякуючы прымяненню заданняў на выбар, аказваецца магчымым вызначыць узровень пазнавальнай актыўнасці навучэнцаў на аснове паказчыкаў, якія праяўляюцца толькі ў сітуацыі выбару.

Заданні на выбар прапаноўваюцца побач з практыкаваннямі падручніка і ажыццяўляюць той жа напрамак у развіцці пазнавальнай актыўнасці, што і сістэма практыкаванняў. Больш таго, сістэма заданняў на выбар абапіраецца на сістэму практыкаванняў падручніка і звязана з ёй.

Рэальна прапаноўваць на ўроку 1–2 заданні на выбар.

Работа з заданнямі на выбар мяняе падыход навучэнцаў да вучэбнага матэрыялу. Увага засяроджваецца на сутнасці моўных з'яў, пашыраецца сфера прымянення ведаў, змяняюцца матывы, якімі кіруецца навучэнец, выбіраючы заданне.

Можна вылучыць наступныя матывы:

I тып – якія маюць практычнае значэнне для навучэнца: практычныя заданні ўсведамляюць як важнейшыя (карысныя заданні);

II тып – звязаныя з эмацыянальнымі перажываннямі пры ўключэнні ў самастойную дзейнасць і праяўленнем інтэлектуальных сіл (падабаецца);

III тып – звязаныя з патрэбнасцю асобы ў праяўленні сябе, у самасцвярджэнні (цікава, на што здольны);

IV тып – якія маюць у сваёй аснове патрэбу ў навізне (даведваюся многа новага);

V тып – у якіх адлюстраваны эмацыянальныя перажыванні, суб'ектыўна звязаныя з радасцю адкрыцця (цікава зрабіць вывад, стварыць штосьці самому);

VI тып – адлюстроўваюць узнікшую патрэбнасць у праяўленні творчых сіл (думаеш па-свойму і адчуваеш сябе свабодным; можна па-сапраўднаму разгарнуцца);

VII тып – тых навучэнцаў, якія лічаць, што лепш, калі заданне даецца без магчымасці выбару (люблю, калі ўказана дакладна, што трэба зрабіць; звычайнае практыкаванне заўсёды лягчэйшае).

Крыніцы матываў IV, V, VI тыпаў ідуць ад самой пазнавальнай дзейнасці навучэнца; матывацыя гэтых тыпаў характэрна для высокага ўзроўню пазнавальанй актыўнасці. Крыніцы матываў I і III тыпаў не ідуць ад самой пазнавальнай дзейнасці; матывацыя гэтых тыпаў характэрна для больш нізкага ўзроўню развіцця пазнавальнай актыўнасці, як і II тыпу, дзе матывацыя неканкрэтная, актуальнасць

няўстойлівая. VII тып матываў вызначаецца недастатковай падрыхтаванасцю навучэнцаў.

Навучэнцы, якія пастаянна працуюць з заданнямі на выбар, дэманструюць больш высокую ступень разумення ўнутранай логікі вывучаемага прадмета, авалодання рацыянальнымі спосабамі разумовых дзеянняў: уменнямі аналізаваць, выдзяляць істотнае, агульнае ў граматычных з'явах, выпрацоўваць самастойныя меркаванні.

Такім чынам, пры пастаянным выкарыстанні заданняў на выбар, паступова змяншаецца колькасць навучэнцаў, аднесеных да III узроўню, і павялічваецца колькасць, аднесеных да I і II узроўняў.

**Літаратура**

1. Активизация познавательной деятельности младших школьников / Под ред. М.П. Осиповой, Н.И. Качановской. – Мн., 1987.
2. Харламов И.Ф. Как активизировать учение школьников. – Мн., 1975.
3. Шамова Т.И. Активизация учения школьников.– М., 1982.

# ИСТОРИЯ РИЧАРДА III КАК ПРИМЕР ПОЛИТИЧЕСКОЙ ФАЛЬСИФИКАЦИИ

**А.В. Кашкевич**
Беларусь, г. Борисов
Борисовский государственный педагогический колледж